Дополнительным рычагом развития становится движение агроэкотуризма, которое позволяет активизировать не только природные факторы, но и культурно-историческую среду агрогородков.

Беларусь обладает рядом предпосылок для развития агроэкотуризма. Приоритетность и особый статус этого вида туризма подтвержден в 2006 г. Указам Президента Республики Беларусь №372 «О мерах по развитию агроэкотуризма в Республики Беларусь».

Белорусский агроэкотуризм достаточно молод. Его развитие началось с образования в 2002 г. общественного объединения «Агроэкотуризм».

В последнее время агроэкотуризм в Беларуси получил значительную государственную поддержку и был причислен к национальным приоритетам. Основополагающими документами в этой области явилась Национальная программа развития туризма в Республике Беларусь на 2006–2010 гг. и уже упоминавшийся ранее Указа Президента Республики Беларусь № 372. Национальная программа развития туризма в целях поддержки развития агроэкотуризма предусматривает такие направления работы, как создание туристических деревень с традиционной архитектурой на основе существующих поселений, организация сельских туров с привлечением местного населения, создание агроэкологических комплексов на базе сельского промышленного комплекса и организацией активного отдыха в естественной окружающей среде.

Одним из возможных направлений деятельности агротуризма считается восстановление поселений, былых усадеб, в первую очередь тех, которые имеют богатую вековую традицию. Они обладают ценным историко-культурным наследием, природными ресурсами, позволяющими развивать их как центры туризма местного уровня. Подобных усадеб, фальварков, имений на территории Беларуси 100 лет назад было более 8000. В настоящее время сохранилось около 1200 исторических усадеб и их фрагментов, из них более 300 перспективны для восстановления и современного использования.

Сохранение нашей самобытности, национальных, культурных традиций белорусского села: преданий, обычаев, особенности уклада жизни, искусства, местных ремесленников, традиций народного зодчества имеют значимое место в исторической судьбе нашей страны.

Памятники истории и культуры – это вклад белорусского народа в культурную сокровищницу мировой цивилизации. Степень их сохранности и уровень благоустройства способствует развития международного туризма.

В Беларуси существует возможность расширить диапазон служения агрогородков народному хозяйству и национальной культуре за счет поиска новых решений, направленных на развитие агрогородков с историко-культурными ценностями, природными особенностями места и с их духовным наследием, природными ресурсами, позволяющими развивать их как центры туризма местного уровня.

ЛИТЕРАТУРА


1. Государственная программа возрождения и развития села на 2005–2010 годы. – Минск : Беларусь, 2005. – 96 с.
2. Основные направления государственной градостроительной политики Республики Беларусь на 2007–2010 годы. Государственная схема комплексной территориальной организации Республики Беларусь : утв. Указом Президента Респ. Беларусь 12 янв. 2007 г. №19. – Минск : Минскпроект, 2007. – 120 с.
3. Об утверждении Основных направлений государственной градостроительной политики Республики Беларусь на 2011–2015 годы :Указ Президента Респ. Беларусь от 30.08.2011 № 385.
4. О мерах по развитию агроэкотуризма в Республики Беларусь : Указ Президента Респ. Беларусь от 2.06.2006 г. № 372.
5. Гурулев, О.К. Традиции и современность в архитектуре села / О.К. Гурулев. – М. : Строиздат, 1982. – 114 с.
6. Кудиненко, А.Д. Планировка и застройка сельских населенных мест : учеб. пособие / А.Д. Кудиненко, И.Г. Маяков. – Брест : Изд-во БГТУ, 2004. – 154 с.


**УДК 72.009**

## МАНУМЕНТАЛЬНАЯ СКУЛЬПТУРА БЕЛАРУСІ І АРХІТЭКТУРНАЕ АСЯРОДДЗЕ, СПЕЦЫФІКА СІНТЭЗУ НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

***М.П. ЧАЙКО***
***(Гродзенскі дзяржаўны універсітэт імя Янкі Купалы)***

*Акрэсліваецца характар адносін архітэктурна-прасторавых і скульптурных форм, якi ўласцівы горадабудаўнічай сітуацыі ў Беларусі на мяжы XX–XXI стст. Адзначаны асаблівасці архітэктурна-скульптурнага вырашэння манументальнага твора: праблемы архітэктурнай прывязкі,*



Ellotsksu

*добраўпарадкавання. Актуалізавана пытанне прафесійнага дыялогу паміж архітэктарамі, мастакамі і дызайнерамі. Матэрыял змяшчае крытычныя заўвагі, якія канстатуюць негатыўныя з'явы ў фарміраванні сучаснага матэрыяльнага і духоўнага асяроддзя бытнасці чалавека.*

Архітэктура і скульптура аб'яднаны ў каштоўнае новае высокае адзінства, дзе з асаблівай значнасцю раскрываецца вобразная сіла, традыцыйна акрэсліваецца як сінтэз мастацтваў. Мастацкае адзінства, заснаванае на сінтэзе мастацтваў, эстэтычна арганізоўвае матэрыяльнае і духоўнае асяроддзе бытнасці чалавека. Сінтэтычнае цэлае, што грунтуецца на вобразным сімбіёзе скульптуры і архітэктуры, – духоўная каштоўнасць нацыянальнай культуры.

Манументальная скульптура Беларусі на розных гістарычных этапах дэманструе шэраг высокамастацкіх твораў, заснаваных на прынцыпах архітэктурна-скульптурнага сінтэзу. Першым значным дасягненнем беларускіх скульптараў з'яўляецца афармленне архітэктурна-скульптурнага комплексу Дома ўрада БССР (1932–1934). Важным этапам ў галіне манументальнага мастацтва ў першыя пасляваенныя гады (у 1954 г.) стаў ансамбль на плошчы Перамогі ў Мінску, выразнасць мастацкай формы якога грунтуецца на сінтэзе архітэктурных і скульптурных форм. 1960–1970-я гады з'яўляюцца важным этапам у развіцці скульптуры, бо звязаны з уздымам манументальнага мастацтва. Напрацоўкі ў галіне сінтэзу архітэктуры і манументальнай скульптуры даваенных гадоў, вопыт праектавання ў гады вайны, падтрымка з боку дзяржавы, асабісты вопыт мастакоў-сведкаў прывялі да стварэння шэрага вобразаў, моцных па свайму ўнутранаму духу, філасофіі і зместу [1, с. 23].

У гісторыю беларускага мастацтва 1960–1970-я гады ўвайшлі як час узвядзення шматлікіх манументальных помнікаў, скульптурна-архітэктурных комплексаў ("Курган Славы", "Брэсцкая крэпасць – герой", "Хатынь" і інш.). Манументальныя творы "Прарыў" (1974), "Праклён фашызму" (1983), помнік маці-патрыётцы (1974) – сумесныя распрацоўкі архітэктараў і скульптараў. Назапашаны вопыт ў вырашэнні праблемы сінтэзу мастацтваў папярэдняга перыяду актыўна ўплывае на развіццё манументальнага мастацтва сучаснасці: каштоўныя творчыя прынцыпы сінтэзу архітэктуры і скульптуры, выпрацаваныя ў 1960–1980-я гады, чырвонай ніткай праходзяць скрозь беларускае манументальнае мастацтва, знаходзяць сваё адлюстраванне і ў шматлікіх сучасных работах [1, с. 23].

Спецыфіка ўзаемаадносін архітэктурных і скульптурных форм на сучасным этапе стварае складаную і неадназначную карціну "мастацкага дыялогу". Сінтэз як сродак дасягнення мастацкай выразнасці ў сучаснай манументальнай скульптуры – з'ява рэдкая. Усе часцей архітэктурна-скульптурнае вырашэнне манументальнага твора – прыклад дысанансу, дзе праблемы архітэктурнай прывязкі і добраўпарадкавання стаяць на першым месцы. Мастацтва ансамбля, як вышэйшая праява кампазіцыйнага майстэрства і сродак увасаблення мастацка-эстэтычных і горадабудаўнічых ідэй, не характэрна для сучаснай карціны развіцця манументальнай скульптуры. Скульптары часцей арыентаваны на стварэнне замкнёнага ў сабе самакаштоўнага твора, а не на гарадскі кантэкст.

Адной з асноўных праблем у сённяшнім манументальным мастацтве застаецца пытанне ўзаемадачынення архітэктуры і скульптуры. Адсутнасць дыялогу паміж архітэктарамі, мастакамі і дызайнерамі перашкаджае перспектыўнаму праектаванню. Сугучна меркаванне М. Баразны: "Сучасная архітэктурная пластыка ў стане акумуляваць розныя формы. Але многае залежыць ад таго, наколькі архітэктар зможа задзейнічаць асяродак" [2, с. 10]. У цэнтры вызначанай праблемы – аўтаномны характар развіцця мастацкай і архітэктурнай школы, уласцівы апошнім дзесяцігоддзям [2]. Гэту праблему ўзмацняе новы прынцып увядзення манументальных мастацкіх твораў у прастору горада. У папярэдні (савецкі) перыяд праектаванне манументальнага твора, як правіла, адбывалася адначасова з агульным праектам горадабудаўнічай сістэмы. На сучасным этапе характэрна ўжыўленне манументальнага твора ў існую сфарміраваную прастору.

Не менш важная праблема ў дасягненні гарманічнага мастацкага вобраза ў кантэксце асяроддзя – featureнастылёвы характар архітэктурных і скульптурных форм. Разглядаючы гэту тэндэнцыю, варта адзначыць, што візуальны пластычны рад манументальных прац, які захаваўся з мінулай эпохі, заўважна дысаніруе з эстэтыкай навейшай архітэктуры, што моцна змянілася за апошнія гады. Лёгкія сучасныя архітэктурныя формы, высокаэстэтычныя будаўнічыя матэрыялы і канструкцыі, якія дазваляюць стварыць чыста архітэктурнымі прыёмамі выразныя мастацкія эфекты, патрабуюць змянення фармальнай структуры манументальна-дэкаратыўных твораў і прынцыпаў іх увядзення ў архітэктурную прастору [3, с. 23].

Наступная тэндэнцыя сучаснай манументальнай скульптуры Беларусі, пад уплывам якой законы сінтэзу архітэктурных і скульптурных форм парушаюцца, – арнаменталізацыя. Звышпараднасць, дэкаратыўны рэпрэзентатывізм, як якасныя катэгорыі сучаснай манументальнай і манументальна-дэкаратыўнай скульптуры, сталі заканамернымі і вылучаюцца па сваіх мастацкіх прыкметах у асобную



Polotsk SU

мастацкую з'яву, "феномен арнаменталізацыі" [4]. Мноства навейшых скульптурных кампанентаў урбаністычнай прасторы Беларусі цалкам падыходзяць пад Хэльгуэраўскае вызначэнне арнаменталізацыі як неабавязковых, але надта пампезных дадаткаў да забудовы. Выкананая ў спрошчанай постсацыялістычнай стылістыцы, якая атрымала ў спадчыну класіцызм, арнаментальная бронзавая пластыка часта выглядае іншародна ў дачыненні да форм і матырыялаў сучаснай архітэктуры. Аднак на працягу апошняга дзесяцігоддзя скульптурныя элементы такога роду працягваюць актыўна ўкараняцца ў гарадское асяроддзе [4, с. 29].

Яшчэ адным фактарам, што ўплывае на адсутнасць мастацкага ўзаемадзеяння манументальнага твора і архітэктурнага асяроддзя, з'яўляецца стыхійны выбар месца, пляцоўкі для помніка. "Ужыўленне" скульптуры ў гарадскую сітуацыю вельмі часта носіць штучны, выпадковы характар, ініцыяваны непрафесійным рашэннем з боку мясцовага адміністратыўнага апарату.

Аднак у агульным кантэксце дызгарманічных адносін архітэктурна-прасторавых і скульптурных форм, уласцівых цэламу шэрагу мастацкіх твораў, рэалізаваных за апошнія дзесяцігоддзі на Беларусі, нельга адмаўляць зніжэнне прафесійнай адказнасці з боку аўтарскага калектыву. Калі архітэктары і скульптары не дасягаюць вобразнага і кампазіцыйнага адзінства помніка ці мемарыяла, недасканалымі з'яўляюцца арганізацыя прасторы, узгодненасць маштабу, прапорцый, рытму.

Праца скульптара, які ўдзельнічае ў фарміраванні навакольнага асяроддзя, акрэсліваецца двума асноўнымі фактарамі. *Першы* – пластычная спецыфіка, эмацыянальна выразныя асаблівасці гэтага віду мастацтва. Аднак самі па сабе мастацкія сродкі выразнасці не гарантуюць "уключэння" мастацкага твора ў канкрэтнае архітэктурнае асяроддзе.

*Другім* фактарам з'яўляецца пошук вобразна-кампазіцыйнай структуры, якая забяспечыць зліццё, узаемаўздзеянне скульптурных і архітэктурных форм. Скульптар-манументаліст павінен не проста знайсці гармонію ў кампазіцыі, а акрэсленую форму вобразнага ладу, зыходзячы з задач наваколля, каб упісаць яе ў асяроддзе, падпарадкаваць яе рытмы і абрыс ландшафту і архітэктуры. Па-сутнасці, гэтыя пытанні складаюць разам сістэму зносін у асяроддзі, ці "кантэкст асяроддзя". Між тым неабходна памятаць аб тым, што фактар фарміравання асяроддзя – гэта не толькі набор функцыянальных і горадабудаўнічых асаблівасцей, але і гістарычна складзенае наваколле. Скульптар уводзіць створаны сёння твор у сфарміраваны арганізм, што ў сваю чаргу вельмі часта правакуе канфлікт, дызгармонію новай прасторы.

Культурная прастора мяжы XX–XXI стст. прадстаўлена помнікамі, мемарыяламі, мемарыяльнымі комплексамі, творамі манументальна-дэкаратыўнай скульптуры, якія можна падзяліць на тры групы. Крытэрыем падзелу скульптурных твораў з'яўляецца ўключэнне манументальнага твора ў канкрэтнае архітэктурнае асяроддзе і яго вобразна-пластычнае вырашэнне ў кантэксце горада.

Творы *першай* групы можна ўмоўна акрэсліць як *"сімбіёзныя"* – прыклады сінтэзу мастацтваў, дзе відавочны працяг лепшых традыцый папярэдняга перыяду і ўзбагачэнне мастацкага вобраза сучаснымі сродкамі выяўлення. "*Сімбіёзны*" твор прадстаўляе магчымасці скульптара, які працуе над эстэтычнай арганізацыяй асяроддзя, дзе скульптура не толькі ўзаемадзейнічае з прасторай, а з'яўляецца кампанентам прадметна-прасторавага наваколля, часта і яго дамінантным пачаткам. Прастора выступае не толькі як поле актыўнасці скульптуры, а ўваходзіць у склад цэласнага пластычнага вобраза, што ў манументальнай скульптуры знаходзіць сваё ўвасабленне праз філасофскае абагульненне падзей і з'яў. Манументальны пластычны твор акрэслівае мастацкае рашэнне асяроддзя, прыўносіць эмацыянальна-вобразны змест.

Вышэйакрэсленыя магчымасці манументальная скульптура Беларусі на сучасным этапе рэалізуе ў мемарыяльных ансамблях з дапамогай цэлага комплексу мастацкіх сродкаў і ў значнай ступені за кошт прасторава-кампазіцыйнай драматургіі. Асяроддзе ўспрымаецца не толькі як фактар прасторы, але і як фактар значнай эмацыянальнай сілы, што ўцягвае, далучае гледача ў кругаварот вобразаў, перажыванняў, пачуццяў. Яркі прыклад такога ўздзеяння – мемарыял "Яма. Мінскае гета" (2000, архітэктары Л. Левін, Я. Дзятлаў, А. Капылоў, скульптары Э. Полак, А. Фінскі). "*Сімбіёзны*" характар узаемадзеяння горадабудаўнічай, магістральнай структуры і манументальнага ансамбля ўласцівы храму-помніку сынам Айчыны, якія загінулі за яе межамі, на востраве Мужнасці і Смутку ў Мінску (1996, аўтарскі калектыў – Ю. Паўлаў, М. Каралёў, Т. Каралёва-Паўлава, Г. Паўлава, А. Паўлаў, Д. Хамякоў), мемарыялу "Воінам-пагранічнікам" у Гродна (2004, скульптар Г. Буралкін, архітэктар С. Федчанка). Акрамя мемарыялаў, у сучаснай манументальнай скульптуры ёсць прыклады гарманічнага ўключэння скульптурнага твора ў гістарычны кантэкст горада, дзе архітэктура выступае як аб'ядноўваючая база, а пластычны твор пераўтвараецца ў сімвалічна-вобразную форму ("Хлопчык з гадзіннікам" скульптара П. Вайніцкага, "Астролаг" скульптара У. Жбанава).

Творы *другой* групы можна акрэсліць як *"самадастатковыя"*. Пераважная большасць сучасных манументальных твораў – самадастатковыя, замкнёныя ў сабе скульптуры. Арыентаванасць на

“самадастатковасць” ці “самакаштоўнасць” часта супрацьпастаўлена магчымасці ўвязаць твор з наваколлем, што стварае тым самым характар “выпячвання”, антыгармоніі сэнсавых і асацыятыўных кампанентаў кантэксту асяроддзя. Выразным прыкладам гэтай тэндэнцыі з’яўляецца мемарыяльны знак “Беларусь Партызанская” (2005, скульптар В. Занковіч), які ўзмацняе напружанне праспекта. Вертыкаль калоны, якая дамінуе, уступае ў саперніцтва з архітэктурнай прасторай, як вынік – вылучэнне твора з кантэксту наваколля. Прыкладам, калі няўдалае архітэктурнае вырашэнне значна зніжае мастацкія каштоўнасці скульптурнага твора, з‘яўляюцца такія манументальныя творы, як конны помнік Усяславу Чарадзею ў Полацку (2007, скульптар А. Прохараў), “Рагнеда і Ізяслаў” (1993, скульптар А. Арцімовіч, архітэктар І. Марозаў). Адсутнасць прасторава-часавых сувязей з наваколлем, выпадковы характар выбару месца для помнікаў парушаюць гарманічнае раскрыццё вобразаў. Падвоенасць сэнсаў, “эфект, блізкі тэатру абсурду”, назіраем у скульптуры-фантане “Купалле” (2011, скульптар У. Жбанаў, архітэктар М. Гроднікаў).

Да *трэцяй* группы можна аднесці манументальна-дэкаратыўныя творы з выразным “*арнаментальным*” пачаткам [4]. “*Арнаментальныя*” творы актыўна засвойваюць сучасную гарадскую прастору беларускіх гарадоў. Прыкладам таму з’яўляецца надземнае афармленне Гандлёвага цэнтра “Сталіца” на плошчы Незалежнасці ў Мінску, якое складаецца з элементаў раслiннага арнаменту, гербаў і скульптурнай групы (2009, А. Купрыянаў, А. Хараберуш, Л. Пакульніцкі). Справядлівая крытыка ў адрас гэтага твору выказана А. Шамрук: “Скульптурнае дапаўненне пампезнага і нязграбнага архітэктурнага рашэння надземнай часткі комплексу на плошчы Незалежнасці дадало гэтаму псеўдакласічнаму нагрувашчванню граніту адцення кічлівасці. З гэтага часу творы архітэктуры, размешчаныя на плошчы, многія з якіх маюць значную гісторыка-культурную і мастацкую каштоўнасць, разам з помнікам М. Манізера ўспрымаюцца праз прызму ўвекавечанага ў бронзе брэнда завода “Крышталь”, які таксама асацыіруецца са скульптурай маскоўскай ВДНГ 1950-х гг.” [3, с. 24].

Сведчаннем крызісу ў сучасным манументальна-дэкаратыўным мастацтве і адсутнасцю сінтэзу паміж архітэктурнымі і скульптурнымі формамі з’яўляюцца маштабныя рэалізацыі апошняга дзесяцігоддзя – пластычнае афармленне фасаду Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета (2009, скульптары Г. Буралкін, А. Фінскі, М. Шкробат) і Беларускага нацыянальнага цырка (2010, скульптар С. Бандарэнка) [5]. Гэтую думку пацвярджаюць і словы А. Шамрук: “Скульптура на фасадзе тэатра стварае відавочны дысананс з архітэктурным аб’ёмам, збівае яго маштаб і рытмічны лад, парушае мастацка-стылявую гармонію і агульную выразнасць знакавага твора І. Лангбарда” [3, с. 24]. Новае афармленне тэатра, па меркаванні П. Вайніцкага, – “…разбурэнне ўнікальнага гісторыка-архітэктурнага асяроддзя адначасова з грубай неадпаведнасцю стылістыцы будынка – дэталізаваная псеўдакласіцыстычнасць скульптур дысаніруе з прынцыпамі (лаканічнасцю і яснасцю) канструктывізму, які не прымае марнага ўпрыгажэнства” [4, с. 32].

Негатыўную адзнаку мастацтвазнаўцы набыў і аздоблены скульптурнымі творамі сквер Парыжскай камуны, што прылягае да тэатра. Стылістычнага адзінства асяроддзя праектыроўшчыкам дасягнуць не ўдалося – ліхтары, лаўкі і гранітныя дэталі разнастылёвыя. Эклектычнасць і бяссэнсавасць афармлення сквера размываюць фармальную і канцэптуальную яснасць створанага Лангбардам архітэктурна-ландшафтнага ансамбля [4, с. 32]. Між тым нельга не адзначыць актыўнае выкарыстанне мастацкіх сродкаў манументальна-дэкаратыўная скульптуры для стварэння запамінальнага, адметнага асяроддзя беларускіх гарадоў.

Розныя прынцыпы ўзаемасувязі архітэктурных і скульптурных элементаў кантэксту асяроддзя – адлюстраванне працэсу пашырэння мэт і задач сучаснай пластыкі. Можна вызначыць некалькі спосабаў узаемадачынення пластычных аб’ектаў у горадабудаўнічым асяроддзі:

– скульптурны аб’ект з’яўляецца часткай гарадской інфраструктуры, выконвае арганізуючую ролю ці ўключаны ў паркавы мікраансамбль;

– скульптурны аб’ект з’яўляецца мастацкай формай аздаблення архітэктуры ці выкарыстоўвае забудову ў якасці кулісы;

– скульптурны твор па сваёй стылістыцы падпарадкоўваецца архітэктурнай сітуацыі;

– скульптурны твор выступае самастойнай кампазіцыяй, узаемадзеянне элементаў кантэксту асяроддзя не адбываецца.

Такім чынам, дасягненне гарманічнага адзінства прасторава-кампазіцыйных, сэнсава-асацыятыўных і гісторыка-культурных кампанентаў – актуальнае пытанне, якое стаіць перад скульптарамі і архітэктарамі. Мастацкая прастора канца ХХ – пачатку XXI ст. прадстаўлена актыўным пошукам новых форм узаемадзеяння скульптурнага твора і архітэктурнага асяроддзя. Устанаўленне манументальнага твора на сучасным этапе набыло большую свабоду, “дэмакратызм”. Сістэма планавага праектавання ўсіх элементаў гарадской сітуацыі адышла ў гісторыю. Усё часцей спосаб узнікнення скульптурнага твора ў жыццядзейнай прасторы чалавека носіць нечаканы характар.

Апроч праблем сінтэзу, неабходна звярнуць увагу на сучасныя тэндэнцыі фарміравання цэнтральных плошчаў беларускіх гарадоў, іх мастацкую і грамадскую сутнасць.

Манументальная скульптура і архітэктурнае асяроддзе эвалюцыяніруюць разам са зменамі ў ідэйна-духоўным жыцці грамадства. Манументальнае мастацтва Беларусі пачатку XXI ст. ставіць свае архітэктурна-мастацкія задачы, стварае асобы тып прасторы, які фарміруецца на адзінстве скульптурнага твора і яго наваколля, што непасрэдным чынам уплывае на свядомасць чалавека. Традыцыйна манументальны твор выконвае ролю сакралізацыі месца, стварае асобы духоўны сэнс. Вынікам такога ўзаемадзеяння, заснаванага на прасторавых суадносінах, з’яўляецца манументалізацыя асяроддзя.

Новы час, адзначаны пераходам да постсавецкага перыяду, характэрны адыходам ад велічных форм. Грамадская свядомасць уплывае на фарміраванне новага разумення манументальнасці. Аўтарытэтны даследчык эвалюцыі архітэктурнага асяроддзя А. Сардараў сцвярджае: “Грамадска значнымі ў цэнтры нашых гарадоў становяцца гандлёва-забаўляльныя зоны, якія пачынаюць выцясняць традыцыйныя “сакральныя зоны” с прыкладамі манументальнага мастацтва” [6, с. 18].

Фармальныя прыёмы набываюць першаснае значэнне. Традыцыйная для манументальнай скульптуры практыка ўзвядзення манументаў у гонар значнай гістарычнай падзеі або асобы на цэнтральных плошчах не характэрна сучаснасці.

Плошчы беларускіх гарадоў набываюць выразны рэпрэзентатыўны і дэкаратыўны характар. Новая стылістыка актыўна выкарыстоўвае пластычныя аб’екты, пазбаўленыя ўзвышанных ідэалаў: алегарычныя матывы, фантанную скульптуру, раслінны дэкор, анімалістычныя формы. Манументы саступаюць месца творам манументальна-дэкаратыўнай скульптуры. Новую трактоўку архітэктурнага асяроддзя і трансфармацыю манументальнасці дэманструюць сучасныя рэалізацыі добраўпарадквання плошчы Незалежнасці ў Мінску, парка Перамогі ў Маладзечна і інш. Помнікі, прысвечаныя выдатным асобам з гісторыі, творы агульнанацыянальнага гучання, як правіла, вырашаны ў камерным асяроддзі паркавай зоны.

Манументальная скульптура і архітэктурнае асяроддзе эвалюцыяніруюць разам са зменамі ў ідэйна-духоўным жыцці грамадства. Традыцыйнае разуменне грамадска значнага пераходзіць да бытавых, паўсядзённых рэчаў. Велічнасць і ўзнёсласць саступаюць месца парадна-рэпрэзентатыўнаму, дэкаратыўнаму. Стылістычны эклектызм дамінуе над прынцыпам абагульнення манументальнай формы.

ЛІТАРАТУРА


1. Артимович, И.А. Белорусская школа скульптуры / А.И. Артимович ; под ред. В.В. Смольской. – Минск : Белорус. гос. акад. искусств, 2011. – 240 с.
2. Баразна, М.Р. Манументальнае мастацтва Беларусі на сучасным этапе / М.Р. Баразна // Сучаснае манументальна-дэкаратыўнае мастацтва Беларусі: стан і перспектывы : матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 22 снеж. 2011 г. / БДАМ ; рэдкал.: В.У. Смольская [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 7–12.
3. Шамрук, А.С. Монументальное искусство: в поисках новых ориентиров / А.С. Шамрук // Сучаснае манументальна-дэкаратыўнае мастацтва Беларусі: стан і перспектывы : матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 22 снежня 2011 г. / БДАМ ; рэдкал.: В.У. Смольская [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 21–26.
4. Войницкий, П.В. Современные тенденции в белорусской городской скульптуре // Сучаснае манументальна-дэкаратыўнае мастацтва Беларусі: стан і перспектывы : матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 22 снежня 2011 г. / БДАМ ; рэдкал. : В.У. Смольская [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 27–36.
5. Войницкий, П. Черным по белому: скульптуры на здании театра [Электронный ресурс] / П. Войницкий // Архитектура и строительство. – 2009. – № 4. – Режим доступа: http://ais.by/story/2412. – Дата доступа: 24.02.2010.
6. Сардаров, А.С. Монументальное искусство и архитектурная среда / А.С. Сардаров // Сучаснае манументальна-дэкаратыўнае мастацтва Беларусі: стан і перспектывы : матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 22 снежня 2011 г. / БДАМ ; рэдкал. : В. У. Смольская [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 12–20.


**УДК 72**

## ПУТИ СОВЕРШЕНСТВОВАНИЯ АРХИТЕКТУРНО-КОМПОЗИЦИОННОЙ ОРГАНИЗАЦИИ НОВОПОЛОЦКА

***доц. М.М. ШЛЕЙМОВИЧ***
***(Полоцкий государственный университет)***

*Затрагивается актуальная тема совершенствования композиции городской застройки, включая градостроительное регулирование размещения высотных зданий в Новополоцке. Исследуются и анализируются проектные решения по формированию городского пространства, обосновывается необходи-*